На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№№22–23
(3152–3153)

12–15 лютага 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

# Народная Воля

**Да ўвагі!**
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

СКАНДАЛ

## Адліга была нядоўгай

**Беларусь — ізноў тэма нумар адзін на старонках польскіх СМІ. Візіт міністра замежных спраў Сяргея Мартынава ў Варшаву, які даўно быў запланаваны на сёння, 12 лютага, да апошняга моманту знаходзіўся пад вялікім пытаннем. Зноў загучалі заклікі да санкцый у адносінах да Беларусі, абвінавачванні, пагрозы. А ўсё таму, што беларускія ўлады ў чарговы раз задаліся ідэяй падпарадкаваць сваім жаданням польскую меншасць.**

**Як вядома, Саюзаў палякаў у Беларусі два. Адзін прызнаны беларускімі ўладамі, другі — польскімі. Як паведамляла наша газета, нядаўна два саюзы сутыкнуліся ў Івянцы, дзе міліцыя захапіла і апячатала будынак Дома польскага, які належыць саюзу на чале з Анжалікай Борыс. У выніку — сур'ёзны дыпламатычны і міжнародны скандал. Пасол Польшчы ў Беларусі Генрык Літвін быў адкліканы ў Варшаву для кансультацый. Беларускаму паслу ў Польшчы Віктару Гайсёнку перададзена негатыўная рэакцыя польскага кіраўніцтва на тое, што адбылося ў Івянцы. І з кожным днём скандал набывае ўсё больш шырокія абароты.**

**Чым бы ні кіраваліся беларускія ідэолагі і сілавікі, для якіх падпарадкаванне саюза Анжалікі Борыс стала нейкай неадчэпнай ідэяй, для беларуска-польскіх стасункаў яны зрабілі настолькі дрэнную справу, што каб выправіць сітуацыю, спатрэбяцца гады. "Фон" для доўгачаканага візіту беларускага міністра замежных спраў у бліжэйшую заходнюю сталіцу яны стварылі зусім не спрыяльны. І гэта мякка кажучы.**

**Даведаўшыся пра тое, што адбылося ў Івянцы, шэраг польскіх палітыкаў выступілі з патрабаваннем не ўпускаць Сяргея Мартынава ў краіну. Прычым самае непрыемнае для Мінска, што з заклікам выступілі не нейкія "адмарозкі", а адна з вядучых партый — "Права і справядлівасць", якую ўзначальвае Яраслаў Качыньскі, брат прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага. Партыя звярнулася да міністра замежных спраў Радаслава Сікорскага з патрабаваннем, каб візіт Мартынава быў адменены і заклікала прэм'ер-міністра Дональда Туска звярнуцца ў ЕС з прапановай накласці на Беларусь гандлёвае эмбарга.**

**Дарадца прэзідэнта Польшчы ў справах суайчыннікаў за мяжой Міхал Дворчык зрабіў рэзкую заяву, што нідзе ў свеце палякі не сутыкаюцца з такім парушэннем сваіх правоў і свабод, як у Беларусі. А сам Лех Качыньскі запрасіў на сустрэчу лідэра неафіцыйнага Саюза палякаў на Беларусі Анжаліку Борыс.**

**Напэўна, каб Мартынаў мог, ён бы і сам раптам "захварэў" якой-небудзь "дыпламатычнай хваробай", каб толькі не трапіць у гэта полымя эмоцый. Але Радаслаў Сікорскі адмяняць візіт беларускага калегі ў Варшаву адмовіўся. У той жа час ён публічна, у эфіры тэлеканала TVP INFO, паабяцаў Мартынаву сур'ёзную "мужчынскую размову". Акрамя таго, як паведамляюць польскія СМІ, Сікорскі абмеркаваў праблемы польскай меншасці на Беларусі з Вярхоўным прадстаўніком ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан, і еўракамісар таксама выказала занепакоенасць і незадаволенасць тым, што адбываецца ў Беларусі. Так што можна не сумнявацца, што працяг у гэтай гісторыі будзе. Падобна на тое, што адліга ў беларуска-польскіх стасунках была нядоўгай.**

**Алена НОВІКАВА.**



Ля Польскага дома ў Івянцы.

## *МВФ прагназуе страты Беларусі ў два мільярды долараў*

Міжнародны валютны фонд папярэдне ацаніў страты беларускай эканомікі з-за змен умоў імпарту нафты. Гэтыя страты могуць скласці 2 мільярды долараў.

Пра гэта заявіў кіраўнік місіі МВФ, якая ад 3 лютага працуе ў Беларусі, Крыс Джарвіс падчас выступу на міжнароднай канферэнцыі ў Мінску.

АЛІМПІЯДА-2010

## Два тыдні шчасця для балельшчыкаў

Ну вось і дачакаліся! Заўтра раніцай (прамая трансляцыя пачнецца ў 3.55 раніцы па беларускім часе) адбудзецца афіцыйнае адкрыццё XXI зімовых Алімпійскіх гульняў у Ванкуверы.

Як вядома, беларускіх спартсменаў мы зможам убачыць толькі ў шасці з усіх пятнаццаці відаў спартыўных дысцыплін, якія будуць прадстаўлены на Алімпіядзе — хакеі, біятлоне, фрыстайле, лыжных гонках, каньках і гарналыжным спорце.

Сёння сваімі ўражаннямі аб тым, як даляцела наша каманда, як уладкавалася ў Ванкуверы і які настрой у спартсменаў, падзяліўся прэс-сакратар Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Пётр Рабухін:

— Сядзець у аэрапортах Варшавы і Таронта не давялося. Толькі выходзілі з аднаго самалёта, як адразу ж аб'яўлялася пасадка на наступны. З-за таго, што рухаліся на Захад, начны час павялічыўся і практычна склаў суткі. Аднак стаміліся не вельмі. У самалётах ляцелі будучыя ўдзельнікі Алімпійскіх гульняў з розных краін, якія гучна абмяркоўвалі адсутнасць снегу ў Ванкуверы і іншыя навіны. Дарэчы, на лайнеры, які ляцеў з Таронта ў Ванкувер, за карыстанне навушнікамі запатрабавалі 3 долары, а за ежу на борце — шэсць! Бясплатна была толькі вада і гарбата. І хоць палёт працягваўся больш за чатыры гадзіны, пасажыраў так і не пакармілі. Давялося ўжо ў Алімпійскай вёсцы па прылёце, каб дачакацца ранішняга сняданку, адрэзаць лусту прывезенага з сабой сала, якое, да слова, нельга было ўвозіць. Але ж — як знайшлі...

А алімпійская вёска на гэтых Гульнях значна меншая па памеры, чым на летніх. І не толькі дзякуючы меншай колькасці краін-удзельніц, але і з нагоды таго, што ў гарах ёсць яшчэ адна такая ж вёска, дзе знаходзяцца ўсе прадстаўнікі лыжных спаборніцтваў за выключэннем фрыстайлістаў. Усе астатнія спартсмены жывуць у Ванкуверы, дзе ў дзень нашага прылёту было 8 градусаў цяпла і ішоў невялікі дождж. У паветры стаіць пах травы, якая ажывае ад зімы, і ўсё гэтае вясновае надвор'е ніяк не стасуецца з тым, што пачынаецца зімовая Алімпіяда. Зрэшты, тых, хто ўжо быў на такіх спаборніцтвах, гэта нікога не здзіўляе. У Нагана і Турыне таксама было цёпла ў горадзе. І толькі ў Солт-Лейк-Сіці і Лілехамеры па-сапраўднаму адчувалася зіма — было да мінус 20...

Да нас прыйшла прыемная навіна — да алімпійскіх стартаў міжнароднай федэрацыяй дапушчаны беларускі лыжнік Аляксандр Лазуткін. Ён стаў 51-м беларускім алімпійцам. Цяпер кіраўніцтва нашай федэрацыі і кіраўніцтва алімпійскай каманды павінна прыняць рашэнне — выстаўляць мужчынскую эстафету 24 лютага ў складзе Далідовіча, Карнеенкі, Іванова і Лазуткіна альбо не выстаўляць. На сёння ў гэтым відзе праграмы заявіліся мужчынскія каманды 14 краін.

У камандах усе здаровыя (праўда, урачы крыху "папрацавалі" са спіной лыжніка Сяргея Далідовіча), настрой добры. Пагутарыў з біятланісткай Дар'яй Домрачавай. Спартсменка лічыць, што "баяцца ёй няма чаго, усе на трасе будуць знаходзіцца ў роўных умовах"...

...І то праўда! Усе спартсмены на самай справе будуць у роўных умовах, а пераможа, безумоўна, мацнейшы. Дарэчы, капітанам нашай зборнай стаў хакеіст Руслан Салей, а сцяг на адкрыцці нёс яго калега па камандзе Алег Антоненка. Паехалі!

**Алесь СІВЫ.**

## *Начинаются слушания по «делу Комарницкого»*

Слушания по уголовному делу бывшего зампреда Госпогранкомитета Евгения Комарницкого начинаются сегодня, 12 февраля, в Верховном суде Беларуси.

Евгений Комарницкий обвиняется в получении взяток. По делу проходят еще два человека.

## *Хтосьці губляе — хтосьці знаходзіць*

Як паведаміла беларуская Федэрацыя хакея, родны брат Уэйна Грэцкі Кіт згубіў у Мінску партаманэт. Зараз звяртаюцца да тых, хто знойдзе, вярнуць яго.

Кіт Грэцкі прыязджаў на "Турнір шасці нацый" у якасці скаўта "Фінікса". Падчас візіту ў Мінск ён згубіў свой партаманэт, у якім знаходзілася мноства важных дакументаў і пропускаў Нацыянальнай хакейнай лігі. Федэрацыя хакея Беларусі папрасіла аматараў гэтага віду спорту дапамагчы ў пошуках згубленага.

Нагадаем таксама, што падчас правядзення "Матча ўсіх зорак КХЛ" з дынамаўскага склада скралі клубны талісман — Зубра. Тады клуб таксама звярнуўся з просьбай дапамагчы знайсці талісман. Чамусьці вярнулі толькі галаву. Тулава "сышло" ў невядомым накірунку.

**Алесь СВЯТЛАНІЧ.**

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

## «Алё, вас слухае галоўны рэдактар!»

*(Заканчэнне. Пачатак у "Народнай Волі" за 9—11 лютага.)*



**— Добры дзень! Кароткін Леанід Раманавіч, Пастаўскі раён. У мяне такое пытанне. Не за гарамі выбары — і мясцовыя, і прэзідэнцкія. Чаму наш галоўны так "элегантна" праходзіць? Я размаўляў з многімі — з Гродна, з Віцебска. Адзін расказаў пра падтасоўку галасоў, другі пра...**

— Але ж словы да справы не падшыеш... Любыя незаконныя дзеянні магчымы, пакуль людзі будуць маўчаць, альбо толькі на кухні абмяркоўваць...

**— Я не абмяркоўваю на кухні. І ні разу не галасаваў за...**

— Думаю, гэта не самы лепшы варыянт. Галасаванне — гэта ўсё ж выказванне сваёй пазіцыі. Праўда, пры гэтым трэба дабіцца, каб падлік галасоў быў справядлівым.

**— Іосіф Паўлавіч, вы няправільна мяне зразумелі. Я галасаваў, але супраць гэтага... А каб не было фальсіфікацый, трэба пасля выбараў пералічваць бюлетэні.**

— Калі ўзнікае такая неабходнасць, чаму і не дабівацца пераліку. Адным словам, за чэсныя, справядлівыя выбары трэба змагацца ўсімі сродкамі, шаноўны Леанід Раманавіч.

**— Гэта Сярэдзіч? Я сёння быў у рэдакцыі... Касцюкевіч Міхаіл Уладзіміравіч.**

— Па якім пытанні заходзілі?

**— Па пытанні рамонту нашага дома па вуліцы Кальцова. Усе паперы даўным-даўно знаходзяцца ў вашага Віталя Гарбузава.**

— Але ж, наколькі я ведаю, ён высветліў, што ваш дом павінен быць адрамантаваны ў першым квартале 2010 года.

**— У першым квартале?**

— Так. Гэта з афіцыйнага адказу, які рэдакцыя атрымала. Калі раптам будаўнікі не стрымаюць свайго слова — тады тэлефануйце, будзем разбірацца.

**— Алё, Іосіф Паўлавіч ёсць?**

— Я вас слухаю.

**— Па-першае, скажу: вы робіце добрую справу.**

— Дзякуй.

**— Заўвага: у газеце выкарыстоўваюцца, на мой погляд, не самыя чытаемыя шрыфты. Трэба каб яны былі больш буйнымі, а то з'яўляецца добры артыкул, а прачытаць яго са слабым зрокам цяжка.**

— Мабыць, вы, шаноўны, маеце рацыю.

**— Другое. Трэба даць у "Народнай Волі" рубрыку "Аб чым пішуць іншыя газеты" альбо "Па старонках газет".**

— Якіх?

**— Любых. Сёння газеты не танныя, купіш адну-дзве, а хочацца ведаць, што там на старонках іншых выданняў.**

— Улічым вашу просьбу.

**— Яшчэ. У вас чамусьці слаба наладжана прапаганда новых кніг. Ні слова пра кніжны гандаль. Я сам некалі працаваў у выдавецтве. Сёння іду ў краму і пытаюся, дзе якая кніжка. Ніхто нічога не ведае.**

— Скажыце, калі ласка, вы пражываеце ў Мінску?

**— Так, у Мінску.**

— А ці можна з вамі дамовіцца, каб вы ўзялі пад сваю апеку наш раздзел "Кніжная паліца"?

**— Я не супраць.**

— Тады давайце знаёміцца...

**— Прэсман Яўген Аляксандравіч.**

— Дамовіліся: неяк стэлефануемся, я прызначу сустрэчу і пагаворым падрабязна аб супрацоўніцтве.

**— Здравствуйте! Из Гродно Филимонов Владимир Григорьевич.**

— Слушаю вас.

**— Мне 73 года. Убежден, что сегодня страна оккупирована криминальным, паразитирующим, коррумпированным чиновничеством, жульем.**

— Видимо, у вас есть основания так думать.

**— Вся организованная преступность находится в стенах и под крышей исполкомов, министерств и ведомств.**

— А если конкретнее?

**— Я построил два завода, которые были уничтожены сегодняшним коррумпированным жульем.**

— Как получилось, кто им позволил уничтожить ваши заводы?

**— Памяркоўны народ. Все молчат — они и действуют.**

— А закон?

**— Когда читаешь Конституцию, душа радуется, какая она у нас хорошая, особенно 1994 года, а на практике — надругательство над человеком. Когда говоришь о Конституции чиновничьему жулью, его просто коробит. Страна живет по понятиям силы, а не по законам...**

— Но вы же как-то вышли из ситуации?

**— Я имею два образования — юридическое и строительное. Когда рухнули заводы, нашел себе нишу в решении жилищной проблемы. Начал строить жилье, поверьте, по 50 долларов за метр квадратный. Вы, видимо, знаете Валерия Дмитриевича Фролова. Когда он был депутатом, я ему говорил: "Давайте я приеду к вам в Палату и прочитаю лекцию, почему мое жилье дешевое и почему дорогое то жилье, которое строят чиновники.**

— Интересно...

**— Я вам объясняю. Сегодня есть строительное управление. Любое, 71-е или 121-е. Его работники заняты конкретным делом — строительством. Но сколько над этими управлениями паразитирующих структур! Вот если бы прислали журналиста, я бы ему такое рассказал...**

— А вы сядьте и напишите... Статейку страниц на семь-восемь...

**— Дело в том, что строить я умею, а вот писать...**

— Тогда договоримся таким образом. Как только у нас появится возможность, мы закинем в Гродно опытного журналиста и вы ему все расскажете и покажете.

**— А позвольте кое-что я вам и по телефону расскажу.**

— Пожалуйста.

**— По чиновничьим нормативам я с семьей в три человека потреблял 27 кубов воды. Значит, соответственно, я потреблял 27 тонн или 27.000 литров. Когда поставил водомер, в жировках расходы снизились до 4—5 кубов. Значит, меня обкрадывали на 22 куба.**

— В пять-шесть и более раз.

**— Расчет, заметьте, таков: за половину объема ты платишь как за горячую воду, а за другую половину — как за холодную. Значит, 11 кубов подогретой воды я вообще не использовал, а с меня брали деньги за ее нагрев. Я 22 куба не сливал в канализацию, а у меня за это брали плату. Если бы у нас были настоящие суды, можно было обращаться с иском, но...**

— Острый у вас взгляд, Владимир Григорьевич...

**— Еще пару слов о реалиях жизни. Знали б вы, сколько подножек мне поставили разные чинуши...**

— Потому что в лапу не давали?..

**— Хотя вымогали, даже целых пять квартир. Я сказал, извините, пожалуйста, я плачу налоги. Покупайте, я весь дом продам. Потом и телевидение приезжало республиканское, сейчас оно, конечно, не поедет. Это было в 90-е годы. Первый раз показали по республиканскому телевидению, а второй раз не показали.**

— Владимир Григорьевич, я прошу прощения, но и другие читатели хотят прорваться на "Прямую линию".

**— Я оставлю вам свой мобильный телефон... Присылайте журналиста.**

— Обязательно это сделаю.

**— Алё, добры дзень. Іосіф Паўлавіч, я ваш пастаянны падпісчык, яшчэ з таго часу, калі вы былі галоўным рэдактарам "Народнай газеты".**

— Адкуль вы?

**— З Гомеля, Сідарук Іван Пятровіч.**

— Слухаю вас.

**— У мяне вялікая просьба: падрыхтуйце добры матэрыял пра людзей, якія сталі інвалідамі Савецкай Арміі. На іх цяпер з боку ўлады нуль увагі, таму, Іосіф Паўлавіч, звярніце ўвагу на былых ваеных.**

— Абавязкова, бяру вашу просьбу пад кантроль. Вось стаўлю адразу тры клічнікі.

**— Другое пытанне. У Гомельскім раёне ёсць вёска Катакузаўка. У гэтай вёсцы пахаваны дзевяць лётчыкаў. Сярод іх два беларусы. Яны разбіліся на самалёце ў ваенным гарадку Зябраўка. Экіпаж самалёта быў з 10 чалавек. Застаўся ў жывых толькі адзін.**

— Якая трагедыя...

**— Дзевяць чалавек пахаваны. Праз год паставілі помнік-абеліск вышынёй чатыры метры. Не так даўно магілы знеслі і зраўнялі з зямлёй. Засталіся стаяць толькі помнікі.**

— Як гэта знеслі? Чаму знеслі?

**— На Каўказе ж зносяць помнікі. Відаць, і нашы прыйшлі да гэтага. Вёска Катакузаўка ад Гомеля 7 кіламетраў. У вёсачцы 18 двароў. А хавалі ў такіх месцах, каб не паказваць страты Савецкай Арміі.**

— А калі лётчыкі разбіліся?

**— У 1952 годзе. Гэта мае аднапалчане. У газетах пішуць прыгожа, што ў нас усё добра. А ў інвалідаў Савецкай Арміі забралі самае неабходнае.**

— Іван Пятровіч, я пастараюся знайсці чалавека, які прыедзе да вас і вывучыць праблему.

**— У мяне ёсць машына, я магу яго завесці на месца.**

— Цудоўна.

**— Трэба толькі пачакаць, калі сыдзе снег.**

**— Добры дзень, Іосіф Паўлавіч. Я — Какарэка Мікалай Аляксандравіч з Мінска. У мяне не пытанне, а, мабыць, разважанне. Газету чытаюць адукаваныя людзі, якія не абыякавыя да лёсу Беларусі. Але хацелася б, каб у публікацыях не было ніякіх абраз. Мы ж усе выйшлі з народа...**

— Вы можаце прывесці канкрэтныя факты?

**— Вось чытаў "О бедном Путине..." Дашкевіча...**

— І каго аўтар абразіў?

**— Ён гаварыў там нешта наконт нашага прэзідэнта, быццам не трэба яму "касіць" пад конюха...**

— Дык гэта ж вобразны выраз.

**— Не трэба, Іосіф Паўлавіч. Мы ўсе пісьменныя людзі.**

— Вы за тое, каб газета была цалкам сухой, казённай, без адзінага вобразнага слоўца?

**— Не, я не хачу, каб газета была сухой, наадварот...**

— А вы самі можаце напісаць які-небудзь матэрыял?

**— Напішу. Але дазвольце адзначыць яшчэ адзін момант. Хацелася б, каб наша родная беларуская мова знаходзіла больш шырокае распаўсюджванне.**

— Я з задавальненнем падтрымліваю вашу пазіцыю.

**— Ёсць літаратурная беларуская мова і не трэба пераходзіць на трасянку або вяртацца да пісьма Скарыны. Я з цікавасцю чытаў Шаранговіча, а вось Садоўскага з цяжкасцю...**

— Праблема адпадае сама па сабе. Цяпер мы павінны дзейнічаць у адпаведнасці з новым законам, а ён не прызнае тарашкевіцкай мовы.

**— Хвіліначку, яшчэ адно пытанне. Хацеў бы звярнуць вашу ўвагу на гістарычную тэматыку. Больш такіх матэрыялаў давайце. Напрыклад, у Навагрудку рыхтуецца да адкрыцця помнік Міндоўгу, а ў "Народнай Волі" я нічога пра гэта не чытаў.**

— Будзем мець на ўвазе, Мікалай Аляксандравіч.

**— З Пінска турбуюць.**

— Зноў землякі? Хто?

**— Хлус Пётр Рыгоравіч. Я вам адпраўляў пісьмо, атрымалі?**

— Нешта не прыгадваю. А пра што пісалі?

**— Я — вязень. Уваходжу ў склад арганізацыі вязняў Пінска. Мы ўсё пішам наконт ільгот. Звярталіся і ў Адміністрацыю прэзідэнта, пісалі і на імя Лукашэнкі, але нашы лісты некуды перасылаюць. Я нават напісаў генеральнаму пракурору, чаму яны займаюцца перапіскай і ні аднаго пытання не могуць самі вырашыць. Атрымаў адказ з пракуратуры, што мы не маем ніякага права ўздзейнічаць на Адміністрацыю прэзідэнта і яго самога. Законы, маўляў, не дазваляюць... Я ўсе копіі адправіў вам.**

— У мяне цяпер ляжыць некалькі пісем, з якімі я павінен схадзіць да прадстаўнікоў улады, каб яны пракаментавалі. Вазьму і вашы...

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

ГУЧНАЯ СПРАВА

## У сям'і Шульмана матрыярхат?

**11 лютага адбылося другое пасяджэнне суда па справе прадзюсера Генадзя Шульмана. Падчас працэсу адзін з пацярпелых заявіў, што грошы Шульман пазычаў не з-за бізнесу, а з-за жонкі.**

На чарговым судовым пасяджэнні суддзя першапачаткова вырашыла выслухаць пацярпелых. Дарэчы, тыя, хто трапіў у суд у якасці ахвяры, выказаліся супраць такога рашэння.

*"Мы не задаволены ходам судовага працэсу,* — гаворыць пацярпелы **Руслан Шэйн**. — *Мы хацелі заявіць хадайніцтва, але нам не далі такой магчымасці. Дзяржабвінаваўца і мы настойвалі на тым, каб першым свае паказанні даваў Шульман. Суддзя сваім рашэннем прымусіла нас сведчыць першымі".*

Падчас расповеду аб абставінах справы **Леанід Шпілько** — адзін з тых, хто пазычаў Генадзю Шульману грошы, — распавёў аб шыкоўным жыцці прадзюсера. Па меркаванні Шпілько, які знаёмы з абвінавачаным яшчэ з інстытута, дырэктар "Класс-Клуб ДК" жыў на шырокую нагу.

*"Прыбытак чалавека ацэньваецца па ўзроўні яго жыцця,* — распавёў на судзе Шпілько. — *Шульман вёў багемнае жыццё з раз'ездамі, вячэрамі ў рэстаране".*

Акрамя гэтага пацярпелы дадаў, што, магчыма, Шульман і не набраў бы столькі пазык, калі б не фінансавыя апетыты яго жонкі. Са свайго боку жонка Шульмана **Святлана** па-ранейшаму адмаўляецца ад любых каментароў.

Іншы пацярпелы **Аляксандр Кангалёў** заявіў, што за свае 20 тысяч долараў, якія ён пазычыў Шульману, ён толькі некалькі разоў бясплатна схадзіў на канцэрты.

Дырэктара прадзюсерскага цэнтра "Класс-Клуб ДК" абвінавачваюць адразу па некалькіх артыкулах, сярод якіх махлярства ў асоба буйным памеры і нават злоснае хуліганства.

Суд падлічыў, што за пяць год Генадзь Шульман набраў пазык больш як на 641 мільён беларускіх рублёў. І гэта не лічачы іншых фінансавых махінацый. Акрамя гэтага, Шульман не плаціў заробак некаторым сваім падначаленым, у прыватнасці кіроўцу, бухгалтару і менеджэру.

Ні па адным з эпізодаў дзвюх крымінальных спраў Шульман не прызнае сябе вінаватым.

**Марыя МАЛЕВІЧ.**

## *Знаете ли вы, что...*

**В 2009 году из бюджетов всех уровней на развитие сельскохозяйственного производства направлено 4,6 триллиона рублей, что в расчете на гектар составляет 593 тысячи рублей, или 212 долларов США.**

**Несмотря на такие инвестиции, только 14 районов выполнили свои обязательства и обеспечили рост производства за счет интенсивных факторов.**

## Лебединая песня белорусского бизнеса

**После формирования Таможенного союза белорусский национальный бизнес может исчезнуть. Такое мнение высказал журналистам председатель Минского столичного союза предпринимателей и работодателей Владимир КАРЯГИН.**

В качестве примера антирыночного поведения белорусских властей глава предпринимательского союза назвал введение с 2010 года 20 процентов ставки НДС, в то время как в России и Казахстане этот налог сохранился на уровне 18 процентов.

Глава союза отметил, что доля малого бизнеса в общем объеме ВВП Беларуси составляет 9,3 процента, а доля налогов в два раза выше — 17 процентов.

*"Это значит, что из малого бизнеса выгребается налогов в два раза больше, чем должно. И поэтому малый бизнес обречен работать в неприспособленных помещениях, использовать устаревшее оборудование. У него нет доступа к инновациям, отсюда — низкая производительность и высокая себестоимость продукции",* — подчеркнул В.Карягин.



Улучшить положение белорусского бизнеса могли бы меры, предусмотренные в Национальной платформе бизнеса. Этот документ — результат совместного труда бизнес-структур и независимых аналитических центров. По оценке руководителя научно-исследовательского центр Мизеса Ярослава Романчука, реализация платформы позволит снизить финансовую нагрузку на бизнес на 15—20 процентных пунктов.

В частности, деловое сообщество предлагает предоставить ИП, работающим по общей схеме налогообложения, право найма любого количества работников, уплачивающим единый налог — до трех работников вне зависимости от родственных связей.

Сейчас проект Национальной платформы бизнеса направлен на рассмотрение в госорганы. Разработчики надеются, что в условиях кризиса власти все-таки пойдут навстречу бизнес-сообществу и снимут запреты, сковывающие предпринимательскую инициативу.

# «Алё, вас слухае галоўны рэдактар!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**— Стэльмах Васіль Іванавіч з вёскі Паложына Бярэзінскага раёна, там дзе Напалеон капялюш згубіў.**

— Слухаю вас, Васіль Іванавіч.

**— У мяне вельмі многа розных пытанняў. Яны сыплюцца, як гарох з парванай торбы. Вось наша вёска, а побач яшчэ... У адной раней было кароў 110, у другой 50—60. А сёння не засталося ні кароў, ні людзей... Моладзь співаецца, не хоча працаваць. Старыя выміраюць. Беспрацоўе. Вада атручана. Лазні няма. У самым высокім месцы зрабілі звалку. Мабыць, вы на дыктафон запісваеце?**

— Так, запісваем.

**— Дык вось, на самым высокім месцы, дзе калісьці стаяў маяк, геадэзічны пункт, там зрабілі звалку. Бярэзінскі райвыканкам 12 год таму забараніў звалку, а потым усё аднавілася. Гэта нейкіх трыста метраў ад маёй хаты. Акрамя таго, што ўсё плыве з палёў, дык яшчэ і з гэтай звалкі ўсялякія ядавітыя шкодныя адходы... Каб у нас быў гаспадар зямлі — гэтага не было б.**

— Васіль Іванавіч, а вы ў апошні час звярталіся да мясцовых улад?

**— Мясцовыя ўлады не чуюць, не бачаць, не разумеюць.**

— А вы выходзілі на ўзровень вобласці, Мінска?

**— Не. Толькі тут, у раёне...**

— Дык вы паспрабуйце прыцягнуць увагу да гэтай праблемы, скажам, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

**— Мусіць, гэта ўсё з аднаго катла.**

— Васіль Іванавіч, зробім такім чынам: па-першае, пра ваш званок я не забудуся, калі буду рыхтаваць матэрыял у газету. Па-другое, калі з'явіцца магчымасць накіраваць да вас спецыяльнага журналіста, то ён у першую чаргу звернецца да вас і вы дапаможаце ва ўсім разабрацца. Разам, можа, і зрушым хвалюючыя вас праблемы.

**— Турбуе Ксяновіч Яўген Васільевіч з вёскі Глыбачка Віцебскай вобласці.**

— Здаецца, мы з вамі ўжо неяк мелі размову?

**— Вы публікавалі мае карэспандэнцыі не адзін раз. Я хачу выказаць сваё захапленне і нават здзіўленне вашай стойкасцю, мужнасцю ў адстойванні праўды, справядлівасці.**

— Дзякуй, спадар Ксяновіч.

**— Я чытаў у "Народнай Волі", што вы маеце намер ліквідаваць "калонку ананіма".**

— Так.

**— Ведаеце, я з гэтай нагоды хачу сказаць вось што. Мне 84 гады. Я за сябе не баюся. Я магу рознае напісаць, таму што я сваё аджыў і, як кажуць, мне не трэба нічога баяцца. Але ў мяне трое дзяцей і 10 унукаў. Ці маю я права рызыкаваць іх дабрабытам, а можа, і жыццём?**

— Спрэчнае пытанне, спадар Яўген Васільевіч. Але давайце зойдзем з другога боку. У рабоў, прабачце мяне, і дзеці будуць рабамі. Таму я ўсё ж такі хачу, каб нашы людзі падняліся з каленяў і не баяліся гаварыць праўду. А калі мы будзем хавацца за псеўданімамі, ваяваць з-за вугла крывым ружжом — нічога ад гэтага не атрымаецца. Ну я ж, вы бачыце, стаўлю свой подпіс пад кожным нумарам "Народнай Волі".

**— Так, ставіце...**

— Вядома ж, я магу памыляцца. Але ж закон дае мне магчымасць выправіць дапушчаныя памылкі. Баяцца за крытыку? Тады лепш наогул не брацца за работу. Калі мы будзем баяцца, то і дзеці нашы будуць такімі ж, і жыццё ў іх будзе такое ж гаротнае. Гэта пяройдзе да ўнукаў, праўнукаў. У рэшце рэшт баяцца трэба тады, калі ты вырашыў, скажам, ісці трыбушыць банкаўскі сейф. Вось ты бойся ісці на злачынства. Бойся забіваць свайго сябра, свайго брата, свайго саслужыўца, любога чалавека. А чаго баяцца праўду казаць?

**— Усё гэта так. Я з вамі згодны. Ваша пазіцыя мне зразумелая, але тут ёсць нюансы.... Таму, перш чым ліквідаваць "калонка ананіма", Вы, Іосіф Паўлавіч, падумайце, калі ласка...**

— Што ж, падумаем.

***

*Тры гадзіны, якія былі адведзены на "Прамую лінію", праляцелі як адна хвіліна. На дыктафоннай стужцы яшчэ дзесяткі пытанняў і маіх адказаў. Шкада, але газетная плошча не дазваляе ўцiснуць усё ў сённяшнюю публікацыю. Тым больш што шмат пытанняў паступіла ў пісьмовым выглядзе. І я абавязаны пракаментаваць на старонках газеты хоць частку з іх.*

**Прывалаў М.Ф. (Мінск):**

**— Хацелася б прачытаць аб тым, як склаўся лёс знакамітых дэпутатаў Вярхоўнага Савета 12-га склікання. Яны ж сыгралі вялікую ролю ў гісторыі Беларусі.**

— Спадар Прывалаў! Я сам быў дэпутатам Вярхоўнага Савета 12-га склікання. Таму мне таксама цікава, як склаўся лёс былых калег па парламенце. Плануем у гэтым годзе надрукаваць цэлы цыкл матэрыялаў, прысвечаных дэпутатам, якія абвясцілі незалежнасць Беларусі, прагаласавалі за шэраг лёсавызначальных законаў, іншых актаў.

**Вольга КАРТУНОВА (Бабруйск):**

**— Чаму палітычныя партыі, той жа рух "За Свабоду" не настойваюць, каб і мясцовыя, і прэзідэнцкія выбары прайшлі ў нас празрыста, з захаваннем усіх дэмакратычных працэдур. Навошта датэрміновае галасаванне, што, зноў назіральнікаў і блізка не будуць падпускаць да сталоў, за якімі члены камісій падлічваюць галасы?**

— Дэмакратычныя сілы за тое, каб выбары прайшлі без парушэнняў заканадаўства. Але ж вы ведаеце, што ўлады пакінулі ў Выбарчым кодэксе столькі шчылін для маніпуляцый, што на чэсныя выбары разлічваць вельмі цяжка. Праўда, за гэта яшчэ можна пазмагацца. Шкада толькі, што няма каму. Калі вы чулі пра тое, што Мілінкевіч рогам паўстаў супраць недэмакратычных дзеянняў улад? А што Ляўковіч? Адштурхнуў ад партыі Казуліна і сядзіць як мыш пад венікам. Дзіўна, але не чуваць маладых лідэраў Партыі БНФ. Памятаеце, як дзейнічаў у свой час Пазьняк! А Янукевіча як быццам і не існуе. Палітычная меркантыльнасць давядзе хлопцаў да таго, што яны наогул разваляць партыю.

**Сяргей КАТУЖАНЕЦ (Гомель):**

**— Вы казалі, што будзеце спрабаваць выдаваць "Народную Волю" тры разы ў тыдзень, а потым, можа, удасца перайсці і на пяціразовы выхад...**

— У мінулым годзе мы ўжо двойчы рабілі спробы перайсці на трохразовы выхад. На жаль, нам не пайшлі насустрач ні "Белсаюздрук", ні абласныя арганізацыі "Саюздруку", якія займаюцца рэалізацыяй газеты праз шапікі. Але ад сваёй мэты мы не адступім. Праўда, многае будзе залежыць ад фінансавага стану рэдакцыі. Вось ужо тры тыдні як падатковая інспекцыя заблакіравала банкаўскія рахункі. Як толькі сітуацыя выправіцца, будзем думаць, як прарваць блакаду і дастаўляць газету падпісчыкам і ў шапікі не два разы ў тыдзень, а тры і нават пяць разоў.

**Эдуард КАМЯНЕЦКІ (Навапалацк):**

**— Чаму "Народная Воля" не звяртаецца па дапамогу да багатых людзей. У нас жа ёсць алігархі, у якіх грошай — мільярды.**

— Спадар Эдуард! Калі вы ведаеце, да каго можна звярнуцца і хто дапаможа — калі ласка, падкажыце. Шматлікія спробы рэдакцыі выйсці на такіх людзей пакуль не далі вынікаў. Беларусь — не Украіна, дзе нацыянальны капітал дзейнічае адкрыта, разам з усімі дэмакратычнымі сіламі змагаецца за пашырэнне інфармацыйнай прасторы.

**Ніна МАЦЮШЭЎСКАЯ (Брэст):**

**— Іосіф Паўлавіч, вы аптыміст? Верыце ў тое, што ў нас нешта зменіцца?**

— Скажу шчыра: калі б я не быў аптымістам, то не выдаваў бы "Народную Волю". Ведаеце, колькі крыві, колькі нерваў гэта каштуе! Але я разумею: калі мы хочам, каб нашы дзеці, унукі жылі ў свабоднай, дэмакратычнай Беларусі, за гэта сёння трэба змагацца ўсім.

***

Шмат тэлефонных званкоў, шмат лістоў, якія паступілі ў рэдакцыю з надпісам "Прамая лінія", застаюцца па-за межамі і папярэдняй, і сённяшняй публікацыі. Але не па-за ўвагай рэдакцыі. Мы будзем працаваць над тым, каб кожная ваша прапанова, шаноўныя сябры, знайшла адлюстраванне на старонках газеты. Галоўная наша мэта — зрабіць "Народную Волю" яшчэ больш цікавай, больш змястоўнай, больш карыснай для шырокага грамадства.

Жыве Беларусь!

СПРАВКА

## Экспортные цены на продукцию сельского хозяйства падают

**Средние экспортные цены в январе—ноябре 2009 года по сравнению с январем—ноябрем 2008 года уменьшились (в %):**




*(Из доклада министра сельского хозяйства и продовольствия С.ШАПИРО на коллегии по итогам 2009 года.)*

ВОЗМУТИТЕЛЬНО!

## Почему всякие якжики и высоковские позволяют себе такой садизм?

Здравствуйте, уважаемая редакция "Народной Воли"!

Прочитал исповедь Павла Левшина в материале "Ты давно плакал? Сейчас заплачешь!".

Казалось бы, уже не стоит удивляться тому, что вытворяет "родное государство" с простым человеком, но это потрясает до основания. Не находится слов, чтобы выразить гнев и возмущение беспределом, творящимся в недрах карательной системы. Иначе ее не назовешь.

Почему такие якжики и высоковские позволяют себе такой садизм? Почему они верят в свою безнаказанность? Не потому ли, что их высокие начальники со спокойной совестью (если не с удовольствием) наблюдают, как подчиненные публично зверски избивают ни в чем не повинных людей во время мирных шествий и демонстраций? Ведь ни один из тех, кто избивал видных деятелей оппозиции, сотни других патриотов Беларуси, не был наказан за свою дикую жестокость?! Да и кто их будет наказывать Это же их прямые начальники дают команду хватать на улицах молодых людей, выступающих против правящего режима, вывозить их за город, избивать и оставлять там.

Меня давно занимает один вопрос: этих "гориллоподобных" подбирают в систему МВД по соответствующим признакам или система их такими делает?

Как человек, отдавший полвека своей сознательной жизни воспитанию подрастающего поколения, склонен считать, что в ряды нашей "доблестной милиции" идут психологически подготовленные к таким действиям люди. Подготовленные семьей и так называемой улицей. Система их адсорбирует, обучает и доводит до совершенства в своих инквизиторских навыках.

Передо мной пример (единственный). Сын знакомого после получения высшего милицейского образования стал работать в органах... (рука не поднимается писать "правопорядка"). Спустя несколько месяцев он заявил отцу: я не могу там работать, как они. И ушел.

**Г.С.БУРВАН.**

*г.Пинск.*

ДЫПКУР'ЕР

## «Камендант Майдана» прыедзе ў Беларусь паслом

Новым паслом Украіны ў Беларусі прызначаны **Раман Бяссмертны**. Пра гэта са спасылкай на крыніцу ў сакратарыяце прэзідэнта Украіны паведаміла ўкраінскае выданне "Обозреватель".

У МЗС Украіны, аднак, не сталі каментаваць гэтую інфармацыю. "Пакуль не апублікаваны ўказ прэзідэнта, мы нічога каментаваць не можам", — сказаў прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства.

44-гадовы Раман Бяссмертны па адукацыі настаўнік, з'яўляецца членам прэзідыума партыі "Наша Украіна". У 2007—2009 гадах займаў пасаду намесніка кіраўніка сакратарыята прэзідэнта. У 2005 годзе працаваў віцэ-прэм'ерам па пытаннях адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы ва ўрадзе Юліі Цімашэнка.

На прэзідэнцкіх выбарах 2004 года Бяссмертны быў намеснікам кіраўніка выбарчага штаба Віктара Юшчанкі, а падчас "аранжавай рэвалюцыі" — камендантам акцыі грамадскага непадпарадкавання на Майдане.



Папярэдні кіраўнік пасольства Ігар Ліхавы працаваў у Мінску з сакавіка 2007 года.

**Таццяна КАРАВЯНКОВА, БелаПАН.**

КОМПЕТЕНТНО

*Александр КОЗУЛИН:*

## «Радьков предлагает делать то, что уже практически было сделано, а потом при его участии и загублено»

**Министр образования Александр РАДЬКОВ на недавней ведомственной коллегии заявил, что министерство представило в Администрацию президента "официальный документ по вхождению в Болонский процесс". Беларусь якобы будет активно продвигаться в этом направлении. Почему вдруг стране понадобилось включаться в процесс, от участия в котором еще недавно она отказывалась? За комментарием мы обратились к экс-ректору БГУ Александру КОЗУЛИНУ. В его бытность руководителем БГУ вуз уже разрабатывал учебные программы, соответствующие принципам Болонской декларации, и Беларусь была в шаге от того, чтобы стать членом общеевропейской образовательной структуры.**

Чтобы было понятно, о чем идет речь, напомним: Болонский процесс — это создание единого европейского пространства высшего образования, конечной целью которого является взаимное признание дипломов вузов европейских стран. Декларация была подписана в июне 1999 года в итальянской Болонье. За это время к процессу присоединились все европейские государства, кроме одного — Беларуси. В 2007 году в интервью "Народной Воле" министр образования Александр Радьков заявлял, что *"нет необходимости стремиться в Болонский процесс"*, свою систему высшего образования мы будем развивать, исходя прежде всего из традиции советской образовательной школы.

**— Александр Владиславович, как, на ваш взгляд, можно расценивать недавнее заявление Радькова о том, что Беларусь нацелена вступить в Болонский процесс?**

— Все, что происходит в нашей стране, настолько пронизано лицемерием и фальшью, что принимать очередные заявления власти за чистую монету, особенно когда под этим не заложен фундамент, база, смешно. Поболтать у нас в стране многие горазды. Я уверен, что в ближайшее время ничего в системе высшего образования у нас не изменится. Сейчас заговорили о Болонском процессе только потому, что у власти новая фишка — мы сейчас стремимся в Европу и, значит, должны что-то демонстрировать.

**— То есть вы не уверены, что Министерство образования перейдет от заявлений к делу?**

— Во-первых, прежде, чем делать такие заявления, и министр, и вся его команда должны были устроить себе публичную порку. Если не хватило мужества уйти в отставку и оставить на совести Лукашенко и Рубинова то, что было сделано со средней школой, то сейчас сначала надо было хотя бы признать свои ошибки, а потом делать подобные заявления. Ведь Радьков предлагает делать то, что уже практически было сделано, а потом при его участии и загублено.

В 2000 году специальным постановлением Совета министров в БГУ был дан старт эксперименту — подготовительной работе по переходу на принципы, заложенные в Болонском процессе. Необходимо было перестроить все учебные планы, программы, методические подходы, комплексы и самое главное — поменять мышление преподавателей. На это ушло почти пять лет. И ряд ведущих университетов страны уже начинал потихонечку внедрять эти программы у себя. Мы автоматически входили в Болонский процесс и решали вопрос адаптации наших студентов в едином европейском образовательном процессе. То есть со временем они могли иметь свободу передвижения, могли учиться в любом европейском университете. Причем могли поступать в один вуз, а потом, по желанию, переходить в другой, причем без передачи каких-то дисциплин, потому что обучались бы по единому базовому стандарту. В 2003 году на Берлинском саммите министров образования стран Европы Беларусь уже заявила о готовности подписать Болонскую декларацию.

Когда многое уже было сделано и в 2006 году в БГУ состоялся первый выпуск бакалавров, убрали Козулина и безо всяких решений сверху, без отмены постановления правительства ректор Стражев эксперимент в БГУ прекратил. А Европейский гуманитарный университет, который вместе с БГУ участвовал в данном эксперименте, был вообще вынужден эмигрировать в Литву.

**— Если были разработаны программы, то сегодня можно их легко вернуть?**

— Для того, чтобы что-то делать, нужна подготовительная работа, требующая очень много усилий и серьезных финансов. Сначала срочным образом надо менять Закон о высшем образовании. В середине 2000-х годов, когда этот закон разрабатывался, в нем закреплялись принципы и схема Болонского процесса — бакалавриат и магистратура, высшее образование разбивалось на несколько уровней. Но в принятом в 2007 году Законе об образовании эти статьи отсутствовали...

Во-вторых, надо создавать базу. Когда-то в БГУ ставилась задача каждому профессору и доценту иметь самостоятельно разработанные курсы лекций и практических занятий, свой собственный учебно-методический комплекс. На выходе выпускники университета должны были свободно владеть хотя бы одним иностранным языком.

И наконец, на мой взгляд, строить систему высшего образования по европейским принципам невозможно без формирования среднего образования. В свое время программы 12-летней школы разрабатывались именно под бакалавриат, они как бы подкрепляли возможность получения качественного высшего образования за четыре года. Ведь 11-е и 12-е классы, как планировалось, должны были быть профильными, предполагалось, что в них останутся только те ученики, которые решили готовиться к поступлению в вуз. Но средняя школа разрушена, изучение иностранных языков сведено к минимуму...

Повторюсь, что все это происходило тогда, когда министерством образования руководил Александр Радьков. Сегодня он заявляет о том, что мы готовы подписать Болонскую декларацию. Как можно относиться к этим заявлениям?! Вопрос риторический.

**Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.**

SOS!

# Беспрацоўны магістр

**Студэнт-"каліновец" Яўген Скрабутан, які ў мінулым годзе закончыў Варшаўскі універсітэт, распавёў "Народнай Волі", як ён спрабаваў уладкавацца на працу ў Беларусі па сваёй спецыяльнасці філолага.**

Маладзёжны актывіст Яўген Скрабутан быў адлічаны з трэцяга курса Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, дзе вучыўся на беларускім аддзяленні філалагічнага факультэта, яшчэ ў 2006 годзе. У загадзе было сказана, што адлічэнне студэнта быццам бы звязана з парушэннем правілаў унутранага распарадку універсітэта. Да гэтага Мастоўскі раённы суд аштрафаваў Яўгена на 290 тысяч рублёў нібыта за незаконную перадвыбарную агітацыю і распаўсюджванне друкаваных матэрыялаў без выходных даных. Пасля гэтага хлопец паехаў вучыцца ў Варшаўскі універсітэт па "праграме Каліноўскага". 25 чэрвеня 2009 года абараніў дыплом магістра беларускай філалогіі ў Варшаўскім універсітэце, прыехаў працаваць дадому...

*"Яшчэ падчас навучання я планаваў вярнуцца ў Беларусь і дапамагаць сваім сябрам-бізнесменам,* — распавядае Яўген. — *Але так атрымалася, што на момант вяртання пачаўся крызіс і практычна ўсе знаёмыя бізнесмены альбо пакінулі свой занятак, альбо з'ехалі з краіны ці перайшлі на дзяржаўную працу. Думаў уладкавацца на якую-небудзь фабрыку ці завод, але тут мне адразу сказалі, што шанцаў прайсці сумоўе ў спецаддзеле, якія існуюць на кожным дзяржаўным прадпрыемстве, не атрымаецца. У абласным жа аддзеле адукацыі паведамілі, што вакансій для настаўнікаў-філолагаў няма па ўсёй Гродзеншчыне. Гродзенскі цэнтр занятасці таксама вакансій не прапанаваў, спаслаўшыся на вялікую колькасць беспрацоўных гараджан, а мне параілі ехаць туды, дзе прапісаны — у Зэльву".*



Пры першым жа наведванні Яўгенам Цэнтра занятасці ў Зэльве адразу ж абрадаваліся — маўляў, спецыялісты з такой адукацыяй тут вельмі патрэбныя, і маецца шмат розных вакансій. Праўда, на той момант у яго яшчэ не было пацвярджэння аб прызнанні ў Беларусі польскага дыплома.

— У рэшце рэшт такое пацвярджэнне было атрымана ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы, — працягвае мой суразмоўца. — І калі прывёз усе неабходныя паперы, то аказалася, што вакансій па спецыяльнасці ўжо няма. Мяне зарэгістравалі беспрацоўным. Праўда, не ведаю, як доўга атрымаецца мець гэты статус, бо калі адмаўляюся ад двух прапанаваных месцаў працы, то аўтаматычна здымаюць з уліку. А прапановы бываюць кшталту трактарыста ці выхаваццеля ў дзіцячым садку ў далёкай вёсцы, бухгалтара...

